Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasylka apłačana ryčałtam

№ 34 Вільня, Чацьвер 29 Кастрычніка 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Пункты ў справе рэлігійнай уніі.

Зьмяшчаем гэтыя „пункты“ ў справе рэлігійнай уніі, прысланыя нам адным з вясковых дзеячоў. У гэтых пунктах адбіваюцца вельмі характэрныя настрої і цікавыя пагляды нашай вёскі, якая ўжо пачынае інтэрасавацца рэлігійнай уніяй.

Рэдакцыя.

Аб рэлігійнай уніі на вёсцы чуваць што раз болей. Пішуць аб ёй у газэтах, гавораць на сабраньнях і нават у казаньнях па цэрквах і касьцёлах. Усе гэтыя гутаркі маюць свой водгук у народных масах і затым я хацеў-бы падаць па парадку, паводле некаторых пунктаў, як глядзіць вясковая інтэлігенцыя на справу рэлігійнай уніі. Рэч зразумелая, што ня буду тут выказваць паглядаў народных масаў, якія ў справе уніі ня маюць яшчэ ніякага паняцьця, а выкажу толькі пагляды тых, якія ўжо разумеюць, што такое унія і якія хацеліб яе правесьці ў жыцьцё.

З гэтых пунктаў адны маюць нэгатыўны характар, а другія — пазытыўны. У пунктах, маючых нэгатыўны характар, я хацеў-бы выказаць тое, чаго не павінна быць у справе уніі, а ў пазытыўных — тое, што павінна быць.

Чаго-ж не павінна быць у справе уніі?

1. Прадусім не павінна быць польскага вышэйшага і ніжэйшага духавенства, якое ня хоча і слухаць аб патрэбах беларускага вароду. Пад вышэйшым духавенствам я разумею польскі эпіскопат у нашым краю на чале з арцыб. Ялбжыкоўскім, а пад ніжэйшым — усё радавое польскае духавенства, мэтай якога ёсьць пашырэньне польскасьці у нашым краю. Часта мне здараецца чуць такія словы: „Хто гэта з праваслаўных беларусаў пойдзе пад загад арцыб. Ялбжыкоўскага! Калі ён з сваімі каталікамі беларусамі гэтак паступае, то што будзе з намі?“ Гэткія настрої існуюць да арцыб. Ялбжыкоўскага. А што датыча польскага ніжэйшага духавенства, то вёска яму таксама ня верыць, відзячы, як блізка яно стаіць да палітычных польскіх кругоў. Нашы вяскоўцы бачаць, што польскія паны і ўрадоўцы ёсьць блізкімі знаёмымі і заўсёднымі гасьцьмі польскага „пробашча“. Відзячы гэны кантакт польскага духавенства з польскімі ўрадовымі кругамі, беларускія сяляне ня могуць адрозьніць, дзе канчыцца духоўная ўлада польскага каталіцкага ксяндза, а дзе пачынаецца сьвецкая ўлада польскага ўрадоўца. Гэта ўсё выклікае вялікі недавер да ўсіх пачынаньняў польскага духавенства ў справе уніі.

2. Другім пунктам будзе асабліўшы недавер беларускай інтэлігенцыі да езуітаў. Ня буду тут гаварыць аб справядлівасьці ці несправядлівасьці гэтага недаверу, на каторы злажылася шмат гістарычных абставін, я толькі сьцьвярджаю факт вялікага недаверу вясковай інтэлігенцыі да дзейнасьці езуітаў. Прадусім, недавер выплывае з гэтай прычыны, што гэтыя езуіты ёсьць палякамі, а другое, што яны-езуіты. Тое, што яны абросшы, носяць бараду і вусы, як праваслаўныя бацюшкі, тут мала памагае, бо ўсякі гледзячы ба іх толькі аб тым і думае, што пад гэтай „барадою“ крыецца.

Праваслаўны чалавек пры спатканьні з імі стараецца разумець, што ў сэрцы гэтых людзей крыецца нейкі падход, а падходу кожны баіцца. Урэшце наш вясковы інтэлігент, узгадаваны на расейскай літэратуры, ня можа таго дапусьціць, каб езуіт ня меў нейкіх пабочных укрытых мэтаў! А якія ён мае мэты апроч рэлігійных, згадаць трудна і затым такі вялікі недавер у нашым народзе да дзейнасьці езуітаў.

3. Трэцім нэгатыўным пунктам ёсьць праводжаньне уніі на нашых землях пад загадамі камісіі „Pro Russia“. Сьведамыя беларусы баяцца ня толькі полёнізацыі, але і русыфікацыі. Дзейнасьць-жа і назоў гэтай камісіі сьведчаць, што ў Рыме не прызнаюць на нашых землях ні Беларусі ні Украіны, а прызнаюць толькі Расею, што для беларусаў і ўкраінцаў вельмі балюча. Каб гэта камісія мела на воку толькі расейцаў у нашым краі, было-б яшчэ паўбяды, але яна расьцягвае сваю дзейнасьць і на беларусаў і на ўкраінцаў . . . Трэба сказаць шчыра, што трудна сабе прадставіць болей няўдалы і назоў і кірунак для гэтай чыста рэлігійнай работы ў нашым краі, як камісія „Pro Russia“. Адно толькі ў абароне тэй камісіі можна было-б сказаць, што назоў яе „Pro Polonia“ быў-бы яшчэ горшы...

Вось і будуць тыя „нэгатыўныя“ пункты, якіх трэба, каб ня было. Бо ані польскае вышэйшае і ніжэйшае духавенства начале з арц. Ялбжыкоўскім, ані езуіты, ані камісія „Pro Russia“ уніі ў шырэйшым маштабе ў нашым краі не правядзе. Тут трэба пашукаць іншых, болей пазытыўных, дзейнікаў. Вылічу іх коратка, бо гаворачы аб тым, чаго не павінна быць я ўжо ня раз даваў да зразуменьня, што павінна быць. Што-ж павінна быць у унійнай рабоце?

1. Першым пазытыўным дзейнікам, бяз якога масовага пашырэньня уніі трудна сабе прадставіць, ёсьць стварэньне беларускага уніяцкага біскупства, незалежнага ад польскіх біскупаў, а толькі ад Апостальскай Сталіцы. Праўда, ёсьць біскуп Чарнэцкі, але ён далёка, бо аж у Дубне, пры гэтым ён не беларус і не заўсёды можа быць з беларусамі, адчуць іхныя патрэбы, праняцца імі і пацягнуць іх да сябе, як гэта зрабіў-бы біскуп беларус. Ды й урэшце, як чуваць, біскуп Чарнэцкі знаходзіцца пад загадамі польскіх біскупаў, а гэта, як я ўжо казаў, шкодзіць уніі.

Біскуп беларус павінен мець пад сваім загадам уніяцкія парафіі, уніяцкае духавенства і дух. сэмінарыю.

2. Унійнай работай павінна кіраваць духавенства беларускае, якое блізка да народу, знае народ і якому народ верыць. Прадусім да унійнай работы павінны далучыцца тыя беларускія духоўныя, якіх народ пазнаў, як сваіх абаронцаў за яго лепшую долю. Ім народ паверыць і за імі пойдзе.

3. Усю унійную працу трэба выняць з пад загадаў камісіі „Pro Russia“, а перадаць яе іншай установе, маючай характар чыста рэлігійны, бяз ніякай палітычнай тэндэнцыі нават у назове. Трэба ведаць, што расейшчына ў нашым краі ўжо цяпер не адыгрывае ніякай ролі і не мае прад сабою ніякай будучыні. Расейцы, якія так ці інакш апынуліся ў нашым краі, польшчацца і можа надыйсьці такі час — і то нават хутка—што расейшчына, як чужы пакост ня маючы каранёў у народных масах знікне з нашага краю, а астанецца толькі беларушчына. Дык камісія „Pro Russia“ тут у нас ня мае нічога да работы і яна для уніі шкодна. Найлепш было-б на мой пагляд, аддаць справу уніі ў нашым краі пад загад кангрэгацыі „Pro Ecclesia Orientali“ (Для Усходняй Царквы).

Вось і будуць тыя пажаданьні і нэгатыўнага і пазытыўнага характару і тыя пагляды, да якіх я дайшоў, абсэрвуючы настрої беларускіх інтэлігентскіх кругоў. Можа гэтыя пажаданьні для некага будуць і непрыемны, але мушу сьцьвердзіць, што яны праўдзівы і канешны. А галоўнае, што яны будуць карысны для уніі, якой, я, як беларус, спагадаю і з боку нацыянальнага і рэлігійнага.

ВЯСКОВЕЦ.

Крызыс камунізму.

Капіталізм, як мы ўжо пісалі ў прошлым нумары нашай газэты, перажывае вялікі вутраны крызыс і дзеля гэтага людзі пачалі шукаць дарогі да новага грамадзкага ладу.

Ведамы ангельска-амэрыканскі пісьменьнік Herbert Uells піша, што зямля цяпер з 1 мільярдам і 900 мільёнаў жыхароў выглядае як мурашнік, у каторым дзеецца штораз горш, бо трэба ўсім гэтым чалавечым істотам даць магчымасьць бытаваньня. І ня толькі даць магчымасьць матэр'яльнага бытаваньня, але і духовага, бо цяпер чалавецтва, дзякуючы працы машынаў мае замнога часу і шукае новых мэтаў і новага спосабу жыцьця. Дзеля гэтага капіталізм павінен прыстасавацца да новых абставін і варункаў жыцьцёвых. Гэтакі вывад робіць Uells.

І праўда, людзі ня толькі цяпер, але праз усе гады існаваньня капіталістычнага ладу стараліся стварыць новую тэорыю, стараліся знайсьці новы шлях да лепшага жыцьця і гэты шлях некаторыя знайшлі ў камунізме.

Камунізм, як тэорыя, вельмі старадаўны, ён існаваў яшчэ прад Хрыстом. Паглыбіў яго і навукова абаснаваў Маркс (†1873) і ад гэтага часу людзі стараюцца яго правесьці ў жыцьцё. Удалося гэта зрабіць у Расеі пасьля кастрычнікавай рэвалюцыі 1917 году, калі бальшавікі — камуністы ўзялі ўладу ў свае рукі і пачалі праводзіць камуністычную тэорыю ў практыцы.

У практыцы аднак камунізм перажывае ад самага свайго пачатку вялікі і глыбокі крызыс, таксама як і капіталізм. Капіталізм, як мы ўжо пісалі ў прошлым нумары „Б. Крыніцы,“ хварэе на недахват справядлівага падзелу запрацаванага дабра, каторага ён вытварае аж замнога, а пры камуністычнай сыстэме дзеецца якраз наадварот: камунізм пры болей справядлівым падзеле, **вытварае замала**, каб заспакоіць усе патрэбы грамадзянства.

Пры камуністычным парадку прадусім няма патрэбнай колькасьці ежы; каб дастаць штонебудзь, трэба прастаяць цэлы дзень у калейцы, як даўней у часе ваенным; тое самае датычыць адзеньня і абутку; тое самае бачым пры аграваньні дамоў і г. д. Паводле апошняга распараджэньня маскоўскага гарадзкога савету тапіць у печах можна ў прыватных кватэрах толькі раз у тры дні, а ў бальніцах, дзіцячых прытулках, кожны другі дзень. Гэта датыча ўрадавых і работніцкіх кватэр, якім выдаецца апал па картачках і якія знаходзяцца пад спэцыяльнай апекаю савецкага ўраду, а па іншых кватэрах холад зімою даходзіць да 5—10 градусаў марозу! І гэтак дзеіцца ў тым краі, дзе вугля, лесу сколькі хочаш, дзе пад бокам вялікія валагодзкія, пэрмскія і архангельскія лясы! Гэты недахват усяго патрэбнага пры камуністычным парадку гаспадараваньня прыводзіць вельмі часта да хістаньня камуністычнай лініі, аб каторым ужо няраз мы пісалі. Гэтае хістаньне ёсьць нічым іншым, як толькі крызысам камуністычнага ладу — і гэты крызыс камунізм перажывае ад самага пачатку свайго **практычнага** існаваньня г. зн. ад 1917 году. Там мы бачым спачатку ваен-

ны камунізм, потым НЭП. потым змаганьні з правымі і левымі ухіламі, потым рашучая колектывізацыя, потым спыненьне колектывізацыі і г. д., словам, з усяго відаць, што камунізм у практыцы заломліваецца, што ён шукае выхаду з крызысу, шукае новых дарог, так як і капіталізм.

Такі самы крызыс мы бачым у савецкіх фінансах. Даўнейшы царскі рубель быў камуністамі абясцэнены — і гэта з камуністычнага боку гледжаньня зусім зразумела: пры абясцаненьні даўнейшай валюты дзяржава пазбываецца ўсіх нутраных а часам і вонкавых (заграбічных) забавязаньняў. Гэтак зрабіла Польшч, гэтак зрабіла і Нямеччына. На месца даўнейшага рубля саветы ўвялі новую валюту — чырвонец, які быў напачатку варт 5 даляраў або 45 зл., цяпеража за савецкі чырвонец заграніцай даюць толькі 3 злотых! Гэтак нізка пала савецкая валюта!

Каб купіць заграніцаю патрэбныя для праводжаньня „пяцігодкі" машыны, камуністы вывозяць заграніцу рэшту свайго золата, прадаюць дарагія каменьні і абразы з музэяў, але і гэта мала памагае. Як падаюць апошнія весткі, нямецкія прамысловыя кругі спыталіся нядаўна ў свайго ўраду, ці ён гварантуе савецкія заказы г. зн. ці ён ручаецца, што савецкі ўрад заплаціць за ўсе заказаныя ў Нямеччыне машыны, то нямецкі ўрад даў адказ, што ён ня можа даць такіх гварантыяў. І нямецкія прамыслоўцы мусілі адказацца ад савецкіх заказаў, тымболей, што ўжо за папярэднія заказы савецкі ўрад вінен болей як 500 мільёнаў нямецкіх марак! З гэтай прычыны разышлася нават чутка, што савецкі ўрад будзе дамагацца мараторыя (адкладу) сплаты сваіх даўгоў, але савецкі ўрад гэтай чутцы запярэчыў.

Як бачым, сьвет захапляе нейкае агульнае банкруцтва, нейкая агульная руіна і агульны крызыс капіталізму так і камунізму. Людзі, не бачачы выхаду з гэтага грознага і цяжкага палажэньня, паддаюцца бязраднасьці, знеахвочаньню і духовай дэпрэсыі. Людзі, стогнучыя пад капіталістычным строем, выглядаюць камуністычнага ладу, ізноў-жа тыя, што знаходзяцца пад камунізмам, жадаюць капіталістычнага парадку, думаючы, што ён іх паратуе. Тымчасам як капіталізм, так і камунізм у практыцы (не ў тэорыі!) перажывае глыбокі крызыс. У што гэты крызыс выльецца, сказаць трудна: можа ў зрэфармаваны і прыстасаваны да практычнага жыцьця камунізм, а можа ў гэткі самы зрэфармаваны капіталізм, а можа ў сынтэзу (спалучэньне) капіталізму і камунізму — гадаць ня будзем. Адно толькі пэўнае, што мы на парозе нейкіх важных падзеяў, калі асновы грамадзкага жыцьця трашчаць і калі сярод вялікага болю ўсяго чалавецтва родзіцца нейкі новы грамадзкі лад. Стары лад адыходзіць, умірае, новы лад, выклікаҭы вынаходам машыны і новымі абставінамі працы яшчэ не прышоў. Чалавецтва яшчэ толькі шукае гэтага ладу, прабуе ўсіх спосабаў, якбы яму датасавацца да новых абставін, выкліканых вынаходам машыны.

А што будзе пры новых вынаходах і новым поступе ў мэханізацыі працы? Што будзе, калі пры ўдасканаленых машынах замест васьмі ці сямі гадзін працы хопіць дзьве або тры, каб заспакоіць усе свае жыцьцёвыя патрэбы? Ці ня будзе тады яшчэ больших уздрыгаў чалавецтва і яго ладу, які наступіць па нас?

Ну, але на гэтае пытаньне няхай адкажа будучыня. эк.

Дзьве душы.

(На маргінэсе „Скарыніі".)

У палове сёлетняга году, часьціна беларускага студэнства, аддзяліўшыся ад Беларускага Студэнскага Саюзу, утварыла сваё асобнае згуртаваньне пад назовам Корпарацыя „Scorinia". Беларускі Студэнскі Саюз у Вільні згуртоўвывае вакол сябе моладзь шмат якіх кірункаў і палітычных поглядаў, аднак у пераважанай большасьці моладзь нацыянальна настроеную, што асабліва закцэнтавалася на апошнім паседжаньні Саюзу. Паўстае пытаньне, што змусіла аддзяліўшыхся студэнтаў да адсэпараваньня ад Саюзу, які зьяўляючыся, паміма розьніцы орыентацыяў сваіх сяброў, арганізацыяй апалітычнай, абсалютна нікога ня змушаў да адрачэньня ад сваіх пераконаньняў. Каб магчы адказаць на гэтае запытаньне, прыглядзімся спачатку некаторым фактам, характэрызуючым зусім нядвузначна новаўтвораную Корпарацыю. Перадусім Корпарацыя „Scorinia", не гаворачы ўжо аб студэнскай солідарнасьці і агульна прынятым паняцьці гонару і этычнасьці, найспакайней пераймае субсыдыі, якія перад тым атрымоўвываў Бел. Студ. Саюз, як арганізацыя рэпрэзэнтуючая ўсё беларускае студэнства. Запамогі даваныя арганізацыі рэпрэзэнтуючай усю моладзь трэба разумець зусім ясна — запамогі ішлі для бяднейшых студэнтаў з агульнага згуртаваньня. Сяньня чамусьці гэтыя запамогі атрымоўвывае не Бел. Студ. Саюз, а Корпарацыя „Scorinia", інакш кажучы, нязначная часьцінка, вылімінаваная з агульнага прадстаўніцтва студэнскае моладзі. Такім чынам запамогу можа атрымаць толькі сябра Корпарацыі, хоць і студэнскі Саюз мае таксама шмат незаможных сяброў. Ужо гэты факт, паказываючы „шчасьлівасьць" сяброў Корпарацыі, найлепш гавора сам аб сабе. Узноў, скваплівае адхрышчываньне Корпарацыі ад таго, што ёй ніхто не закідывае, як гэта было з ведамым бюлетэнем „А.Б.С.А.", асьвятляе „ідэолёгічны" бок сяброў Корпарацыі. Таксама надаваньне філістэрстваў некаторым асобам з ведамым прошлым і сучасным у сэнсе палітычнага дуалізму, нязмогшым запярэчыць цяжкім публічным закідам, зьяўляецца зусім хапаючай аргумэнтацыяй дзеля абаснаваньня пэўных паняцьцяў аб данай арганізацыі.

Не магчыма тут абмінуць і спосабы закладаньня корпарацыі, бо-ж як ужо агульна ведама, у зьвязку з гэтым корпарацыя ў хуткім часе мае быць паклікана за пэўныя дэлікатна кажучы „недакладнасьці" на акадэміцкі суд.

Рэасумуючы ўсё вышэй сказанае, прыходзіцца сканстатаваць, што часьціна беларускага студэнства, выдзяляючыся ў асобнае згрупаваньне, да гэтага нямаючы нават адпаведнае колькасьці староннікаў дзеля праўнага афармленьня свайго згуртаваньня, кіравалася паглядамі не канешна ідэолёгічнымі. Трэба сказаць, што гэты працэс быў яскравым адбіткам дуалізму душы, які ўжо сяньня праводзіцца ў жыцьцё часткаю нашага старэйшага грамадзянства. Толькі з прыняцьцем гэтае канцэпцыі прычынаў выдзяленьня некаторых студэнтаў з агульна-беларускага студэнскага згуртаваньня, з ужо выразным воблічам адзінасьці душы, будзе нам праўдзівым тлумачэньнем выдзяленьня і ўспомненых вышэй фактаў. Тым больш, што сярод сяброў успомненае корпарацыі знаходзяцца такія, каторыя афіцыяльна лічацца і беларусамі і палякамі аднвачасна. Калі цяпер заглядацца на гэта з пункту гледжаньня нацыянальна-беларускага, то трэба думаць, што карысьці ад гэтага дуалізму душаў і пачуцьцяў мы ня зможам атрымаць, аб чым найлепш можа сьведчыць ужо існуючая двойнасьць душаў часткі старэйшага грамадзянства і вынікі гэтага. А мы ведаем, што тое, што не дае карысьці, дае некарысьць, а нават шкоднасьць. Як на гэта зарэагуе неэдуалізаванае студэнства, гэта пакажа хіба блізкая будучыня. Узноў-жа будучыня са зьдзейсьненым беларусказаветным ідэалам скажа, ці меў права беларус-студэнт, у пэрыяд рэалізаваньня агульна-нацыянальнага ідэалу, падыходзіць да яго шляхам двудушнага рэгрэсу, шляхам зматэр'ялізаваных імкненьняў.

Студэнт.

З Беларускага жыцьця.

Зьезд Беларускай Хрысьціянска-Дэмократычнай Партыі. Прэзыдыюм Б. Х. Д. пастанавіў склікаць у Вільню зьезд сяброў-дэлегатаў Бел. Хр. Дэм. Партыі на дзень 5 сьнежня сёл. г. У гэтай справе ўжо падана заява адміністрацыйным уладам дзеля атрыманьня дазволу на зьезд.

Гульня ў палітыку не на мейсцы. Наша рэдакцыя атрымала пісьмо ад Цэнтр. Бел. Прав. К-ту з просьбай зьмясьціць яго ў газэце. Пісьма гэтага цалкам зьмясьціць ня можам дзеля нястачы мейсца, дык падаём толькі факты даволі цікавай, а больш сьмешнай справы.

У апошнія часы, як відаць з гэнага пісьма, не спадабаўся „патрыярхам" Цэнтр. Бел Прав. К-т. Гэтае нездаваленьне з Ц. Б. П. К-ту выразіла чамусьці і Беларускае Дабрадзейнае Т-ва, а за ім і Пэдагагічная Рада Віл. Беларускай гімназіі пісьмом з дня 23 кастр. 1931 г. за № 448, адклікаючы адтуль сваіх прадстаўнікоў. Тымчасам аказалася, што ў Цэнтр. Бел. Прав. Камітэце прадстаўнікоў зацікаўленых не сваёй справай няма і ня было, бо К-т гэны ў сваім часе, прапазыцыю гэтых інстытуцыяў аб прыняцьці ў свой склад ад іх прадстаўнікоў адкінуў, аб

W. A.

Adam i Anielka. 11)

XIII. „Dudka biełaruskaja".

Adam pakulšto žyŭ pry baćku i pamahaŭ u haspadarcy, choć žyćcio było wielmi ciažkoje. Baćka chadziŭ zły, jak had, matka najbolš płakała i narakała, a brat i siastra pahladali na jaho z-pad łobu. Wiečarami zatoje nie siadzieŭ u chacie. Pojdzie, bywała, da Andreja Hanusewiča — tudy najčaściej źbiralisia na wiečaruški — i tam prasiadzić da poznaj nočy. Było niejkaje ruskaje świata, wučni z ašmianskaj škoły pryšli ŭ hości až na try dni. Adzin bojki chłapiec — toj, što, kazali, matka na ksiandza budzie wučyć, tolki, niama wiedama, skul jana hrošy woźmie, dyk toj chłapiec raskazywaŭ ašmianskija nawiny: jak ludzi pa pawietry začynajuć lotać; jak kažuć, što na zorach ludzi žywuć; jak ksiondz z papom u školce paspračalisia: ksiondz kazaŭ, što tut Polšč, a pop — što Rasieja.

— A wy čuli? — pytajecca Andrej Hanusewič.

— A jak-ža, čuli, pad dźwiaryma, a jany ŭ kancelaryi spračalisia, a pop až kryčaŭ.

— Wiš, licha jamu! — skazała adna baba.

— Heta ksiandzu licha, — pierabiła prawasłaŭnaja i pajšli ŭ spor, čyja wiera lepšaja.

— Dajcie spakoj! — kazaŭ Adam. — U Amerycy jość šmat wieraŭ, a nichto za heta nia złuje, ani łajecca. Ty budź taki, a ja hetaki i nikomu nijakaha da mianie intaresu.

— Što ty tam kruciš u rukach? — spytaŭsia Hanusewič wučnia.

— Pahladziecie, dziadźka, heta mnie ksiondz wikary daŭ; pa našamu pišycca.

— Pakažy, pakažy! — usie zacikawilisia.

Hanusewič staŭ čytać:

— Kab ty wiedaŭ, brat kumišča,
Što učora widzieŭ ja:
U panoŭ było ihryšča,
A jakoje, a ja, ja!

— Pa našamu, kab ja tak žyŭ! — až kryknuŭ Hanusewič, — tolki ja nie mahu składna čytać. Čytaj ty, ty-ž wučań.

Wučań staŭ čytać: wychodziła składna i da wieršu, a ŭsie až kłalisia ad śmiechu: „wot piša, dyk piša, a kab na jaho zwod"! Chwalili, słuchali, pierabiwali; zabylisia i rukawicy rabić; stoŭpilisia kala wučnia; iznoŭ śmiajalisia, bo tyki i śmiešna, jak żydy ihrali, a pany padskakiwaii.

— Wot, kab hetak usie knižki pisali, dyk było-b usim paniatna, — kazała staraja Michalewičycha.

— At, pany sami heta napisali, kab z nas paśmiajacca, — skazaŭ Hanusewič: — nam, brat, treba nawuki, kab my razumieli papolsku i, parusku.

Wučań staŭ čytać dalš: „adkaz Jurcy na panskaje ihryšča". Tut jašče bolš śmiajalisia.

— Nu, heta tyki nie pany pisali, bo tut na panoŭ walić, kolki ŭlezie, — skazaŭ niechta.

Čytali całuju knižku, a na samym kancy čytali pačatak. Tut usie až achnuli.

— Čuješ, jon našu mowu chwalić, kaža, što ludzkaja i dobraja. Wot štuki, dyk štuki!

— A bo i praŭda: chaj, jak chto choča, tak haworyć, a ja hawaru paprostu, dyk dla mianie i hetak dobra.

— U kaściele, dyk druhoje dzieła, a ŭ chacie možna i paprostu.

— A što-ž tam u kaściele? Wun ja čuła, jak małady ksiandzok wučyŭ dziaciej, dyk až ślozy sami jduć, tak jon niejak da serca haworyć.

— Ale, praŭda. Stary ksiondz kryčyć, tolki ludziej razhaniaje, a hety dyk wot jak treba čaławiek.

чым запісана пастанова за № 8 з дня 14 сакавіка 1931 г.

Цікава, якую сувязь можа мець Пэдагагічная Рада, заданьні якой ёсьць вучыць і выхоўваць дзяцей у школе, з Бел. Прав. К-там, заданьні якога — беларусізацыя царквы. А яшчэ больш цікава, чаму Пэдагагічная Рада Віл. Бел. гімназіі ў сакавіку лічыла патрэбай належаць да Ц. Б. П. К-ту, а 23 кастрычніка таго-ж году ўважаць пачала ўчасьце сваё там лішнім ці не патрэбным?

Ясна, што тут палітыка, але-ж Рада Пэдаг. павінна глядзець школы, а не палітыкі і не кампрамітавацца, лезучы туды, куды не трэба і куды ніхто не просіць.

Новая кніжка. Вышаў з друку і прадаецца ўва ўсіх беларускіх кнігарнях „Кароткі нарыс псыхолёгіі“ з дадаткам беларуска-расейска-польскага слоўніка псыхолёгічных тэрмінаў і 5-цю ільлюстрацыямі у тэксьце. Аўтарам кніжкі зьяўляецца Д-р Мік. Ільляшэвіч, вучыцель Віл. Бел. гімназіі. Цана кніжкі 1 злот.

З Літоўскага жыцьця.

Зьезд „таўтінінкаў“. На пачатку кастрычніка с. г. у Нез. Літве, у м. Уцяты адбыўся зьезд „таўтінінкаў“ (народнікаў). У зьездзе прыняў учасьце літоўскі прэм'ер Тубаліс, які выступаў з вялікай прамовай на тэму бягучых літоўскіх спраў.

Нарада Цэнтру Акцыі Каталіцкай адбылася 6 кастрычніка с г. у Койне, у якой брала ўчасьце 500 асоб. Між іншымі нарада гэта найбольшую ўвагу зьвярнула на патрэбу заснаваньня каталіцкага ўнівэрсытэту.

Асушка маклякоў. У Літве ёсьць многа балот і ройстаў, якія гаспадаром не даюць ніякай карысьці. Вось-жа Міністэрства Земляробства ў сваім часе пастанавіла прыступіць да асушкі гэных маклякоў і на гэту мэту вызначыла на сёлетні год 6 мільёнаў, 4 тысячы літаў. Дагэтуль асушана ўжо 45 тыс. гэктараў плошчы. У наступным годзе праца каля асушкі будзе прадаўжацца.

Новы ўрад Т-ва вызваленьня Вільні выбраны нядаўна. Ускла́ў яго ўвайшлі і асобы ведамыя Вільні, як проф. М. Біржышка і кс. кан. Тумас.

Новая кніга вышла ў Коўне, выданая мініст. спраў заграні́чных, у якой шырока апісаны польска-літоўскі спор аб адчыненьні дарогі на лініі Ляндварова-Кашадары, а такжа і па Немане. У кнізе гэтай сабраны ўсе дакуманты аб упомненай справе.

Зьезд „ліаўдінінкаў“ (людоўцаў) адбыўся ў Коўне 19 кастрычніка с. г., на якім было да 30 чалавек, як прадстаўнікоў ад гэтай партыі. На зьездзе між іншымі выступаў былы прэм'ер Сляжэвічус, які прамаўляў аб літоўскай замежнай палітыцы.

Віленскае Гаспадарчае Т ва апошнім часам моцна ажывіла сваю дзейнасьць. Як даведваемся з літоўскіх віленскіх газэт, таварыства гэта на вёсках, дзе існую гуртох яго, ладзіць тыднёвыя і двухтыднёвыя гаспадарчыя курсы. Гэткія курсы адбыліся ўжо ў двух мясцох Віл.-Троцкага павету—у Дайнове і Міхальчунах.

Літоўская дэлегацыя да школьнага Куратара ў справах школьніцтва хадзіла 15 кастр. сёл. г. У склад дэлегацыі ўваходзілі: кс. праф. Крауяліс, старшыня „Рытаса“ і дырэктары віленскай і сьвянцянскай гімназіяў. Дэлегацыя гэта вічога пазытыўнага не атрымала.

З Украінскага жыцьця.

Вялікі суд над украінцамі. У Львове ў Акружным судзе ў мінулым тыдні пачаўся суд над 14 украінцамі, якіх абвінавачваюць за дзяржаўную здраду. Суд прадаўжаецца і працягнецца яшчэ нескалька дзён.

Адведзіны канадыйскага пасла Украінца. У пачатку г. м. прыяжджаў у Львоў пасол канадыйскага домініяльнага парляманту, Украінец М. Лучковіч, які цікавіўся украінскімі нацыянальнымі і культурнымі здабыткамі.

Бомбамі нішчуць магілы Украінскіх Стральцоў. У сяле Віворо нехта падлажыў бомбу пад вялікую магілу Украінскіх Січовых Стральцоў. Магіла з крыжам узарвана выбухам бомбы.

З Польшчы.

Вялізарны палітычны працэс. У панядзелак 26 г. м. пачаўся ў Варшаве ў Акружным Судзе суд над берасьцейскімі вязьнямі. На лаве абвінавачаных заселі: 1) Др. Г. Лібэрман, адвакат, пасол усіх польскіх соймаў, падпалкоўнік, правадыр П.П.С. 2) Н. Барліцкі, пасол, б. віцэ-міністр. 3) Др. А. Прагер, пасол. 4) В. Вітас б. старшыня міністраў. 5) Др. Кернік б. міністр і інш. Усіх абвінавачаных 11 асоб. Усе яны абвінавачаны па 100 і 101 арт. к. к. у дзяржаўнай здрадзе. Абвінавачваюць падпракуроры В. Грабоўскі і Р. Раўзэ. Абвінавачаных бараніць выдатныя адвакаты. Усіх адвакатаў, якія бароняць прад судом берасьцейскіх вязьняў налічваецца 18 асоб. Лік сьведкаў і экспэртаў 460 асоб.

Абвінавачаны Лібэрман у трох гадзіннай прамове сьцьвердзіў, што імкнуўся скінуць урад дарогай легальнай. Др. Лібэрман у сваёй прамове заявіў, што, каб у Польшчы была Божая справядлівасьць, дык ён абвінавачваў-бы, а ня быў-бы абвінавачаны. Далей адв. др. Лібэрман казаў, што дыктатура паваліцца пад напорам маральнай сілы народу.

Забастоўка італьянскіх гароднікаў слухачаў у Варшаве зьліквідавана, Магістрат згадзіўся на ўсе дамаганьні гародніх служачых.

„Беларуская Крыніца“ ў м-цы лістападзе выйдзе: 8, 15, 22 і 29-га.

З заграніцы.

Бязраднасьць Лігі Народаў у спыненьні японска-кітайскай вайны. Ліга Народаў дзеля спыненьня японска-кітайскай вайны ў Манджурыі, дня 24 г. м. прыгатавала рэзалюцыю, якую мелася выслаць абудвым урадам пасварыўшыхся дзяржаў. Прадстаўнік Кітаю і Японіі затрэбавалі ўстрыманьня гэтай справы пакуль яны атрымаюць ад сваіх урадаў новыя інструкцыі.

Японскі прадстаўнік атрымаў ад свайго ўраду інструкцыю прыняць прапазыцыю Лігі Народаў з наступнай засьцярогай. Японія гатова спыніць вайну і распачаць эвакуацыю свайго войска з Манджурыі, калі будуць здаволены японскія вымаганьні. У той час, калі японскі прадстаўнік гадзіўся у Лізе Народаў на эвакуацыю японскіх войск з Манджурыі, марш. Чан-суліян „збунтаваўся“ і пачаў новую хатнюю вайну, заатакаваўшы кітайскае войска. У гэтай хатняй вайне бяруць учасьце японскія арапланы, якія збамбардавалі галоўны штаб кітайскіх войск. Такім парадкам японска-кітайскія разрахункі яшчэ больш закрыліся неафіцыяльнасьцяй прад Лігай Народаў. Чым гэта ўгра кончыцца, пакажа будучыня.

Першая канфэрэнцыя прадстаўнікоў найбагацейшых дзяржаў і справа рэвізіі Вэрсальскага трактату. Найбагацейшымі дзяржавамі на сьвеце зьяўляюцца цяпер Зл. Шт. Паўноч. Амэрыкі і Француя. У палавіне гэтага м-ца прэм'ер міністраў францускага ўраду Ляваль адведаў Зл. Шт. П. Амэрыкі, дзе вараджаўся з прэзыдэнтам Зл. Шт. Гуўэрам, як ратаваць ад гаспадарчага ўпадку Эўропу і бараніцца ад грознага сусьветнага гаспадарчага крызысу.

Ведама, што Француя пасьля сусьветнай вайны сталася банкірам Эўропы і дзякуючы гэтаму пашырыла ў Эўропе сваю палітычную гегемонію. Ведама так-жа, што сусьветная вайна закончана Вэрсальскім трактатам, на якім апіраецца пасьляваенны эўрапэйскі „мір“ і францускія на яго ўплывы. А дзеля гэтага Француя моцна трымаецца Вэрсальскага трактату і ўсімі сіламі стараецца яго ўтрымаць у дасюлешняй моцы. Сусім інакш на гэта глядзяць палітыкі Зл. Шт. П. Амэрыкі.

З прычыны нарадаў Ляваля з Гуўэрам аб сусьветным гаспадарчым палажэньні, амэрыканскі палітык сэнатар Бораг з амэрыканскім спакоем заявіў, што прад дагаворамі, як ратаваць трагічнае сусьветнае палажэньне трэба 1) скасаваць рэпарацыі, 2) даканаць тэрыторыяльнай зьмены на карысьць пакрыўджаных, а галоўнае—адданьне Нямеччыне гданскага калідору, 3) скасаваньне ваенных даўгоў, у якіх зацікаўлена, як крэдытарка, Амэрыка.

З такой заявай, рэч зразумелая, прэм'ер Ляваль згадзіцца ня мог і заявіў амэрыканскім журналістам, што ён прыехаў не дыскутаваць над парушанай Борагам справай, а толькі на нараду з Гуўэрам дзеля абароны прад грознай небясьпекай пагражаючай сусьветным гаспадарчым крызысам.

Hetak baby i dziaŭčaty spračalisia. Až i Adam swajo słowa skazaŭ.

— U Amerycy haworać pa anhielsku, ale aproč taho jošć šmat mowaŭ inakšych; francuskaja, niamieckaja, italjanskaja, polskaja.

— A pa prostu tam haworać? — pytajecca wučań.

Usie zaśmiajalisia.

— Niama čaho śmiajacca: haworać i pa prostu, — adkazaŭ Amerykaniec, — tolki stydajucca pa prostu hawaryć. Adzin raz pryjechaŭ naš alšaniec, ale familii nie skažu, i dawaj da mianie krucić jazykom papolsku, a nia ŭmieje. Ja kažu jamu: „Wot ty razumny, adrazu tak łoŭka papolsku haworyš, a ja nie mahu nałažycca i sa swaimi tolki paprostu hawaru, jak i ŭ chacie kališci“. Jon hladzić mnie ŭ wočy, jak baran, dy usio na Polšč zawodzić. „Co ty muwiš?“, kaža da mianie. „Ja kažu tabie, što ty duraŕ“, plunuŭ ja i pašoŭ. Pa mojmu, dyk naša mowa taksama dobraja, jak i druhich ludziej, a jak wot i z maładym ksiandzom hawaru paprostu. Što-ž tam takoje? Żydy swajej pahanaj hutarki nia stydajucca. A naš čałaviek kaža, što paprostu brydka; jano praŭda, kali budzie łhać, abo klaści, dyk i słuchać brydka, a kali haworyš štokoleču dobraje, dyk ničoha brydkaha niama.

— Jano widziš, brat, nia toje; naša prostaja mowa jana pawodle chaty, a dziela nawuki, dyk treba jakoj druhoj mowy, lepšaj, polskaj, abo rasiejskaj, — kazaŭ Hanusewič.

Adnak Amerykaniec rastłumačyŭ usio, jak maje być:

— Mnie ksiondz kazaŭ, što prostuju mowu stali ŭžo i da nawuki prychilać, hazetu mnie nawat daŭ i knižki pakazywaŭ, ale ja dziela kłopataŭ nia mieŭ času i, pryznajusia, što dla mianie z hetych knižak čytać ciažkawata, choć i paprostu pišucca, wiedama, nia prywykšy. A wot naš wučań adrazu staŭ bojka čytać, choć u škołcy tolki parasiejsku wučać.

— Niachaj sabie parasiejsku, a my tyki Biełarusy, — skazaŭ wučań.

— Skul ty, synok, heta ŭziaŭ? My polskija, — hawaryła jamu matka.

— Kab my byli polskija, dyk my hawaryli-by papolsku, a jak my haworym paprostu, dyk my Biełarusy.

— Čujecie ludzi, što hety małady ksiondz panarabłaŭ? — biadawała matka.

— Daj Waspani spakoj i nia bojsia: cia pier usie małady paciahnuli ŭ hety bok; takoje ŭžo pawietra. Wun toj, što pryjaždžaŭ kleryk, ja sam čuŭ, jak z ksiandzom paprostu hawaryli. Daściu wiery? — tak bojka hawaryć, jak repu hryzuć, až ja dziwawaŭsia. Ja heta na śmiech pytajusia, ci to ŭžo ŭ Siminaryi paprostu wučać? A kleryk mnie kaža: „Jašče nia wučać, ale i heta niekali budzie. A nas, kaža, takich Biełarusaŭ užo mnoha jošć. Što-ž, kaža, tut dziŭnoha? Palaki papolsku, Litwiny palitoŭsku, a my, Biełarusy, dyk nam treba pabiełarusku. My sami mij saboju paprostu haworym, čytajem knižki, piajom našyja biełaruskija pieśni.“

— A ci-ž na ich biskup nie naswarycca?

— Heta i ja pytaŭsia, — adkazywaje Amerykaniec: — ale kleryk mnie kazaŭ, što biskup ničoha, bo, kaža, za heta i hrechu niama nijakaha. Každamu mowa swajo lubić.

— Wot dziwa, ał...

На Задушкі.

Віленскія Беларусы на Задушкі (2 лістапада) традыцыйна адведываюць магілкі беларускіх паэтаў на Росах. Сёлета на Задушкі зборка віл. беларусаў а г. 18 пры магіле К. Сваяка.

Італія, як ведама, стаіць за перагляд Вэрсальскага трактату. Італьянскі дыктатар Мусоліні ўжо ня раз у сваіх прамовах выказываў пагляд Італіі на гэту справу, а апошнімі днямі той-жа Мусоліні ў прамове да народу гэты пагляд яшчэ раз пацьвярдзіў такімі славамі: — Ці можна гаварыць аб адбудаваньні Эўропы — заяўляе Мусоліні — калі ня будуць зьменены забавязаньні мірнага дагавору, якія давялі цэлыя народы да ўпадку і матэр'яльнай роспачы? Далей Мусоліні ў сваей прамове даказываў, што і прычына сусьветнага гаспадарчага крызысу знаходзіцца ў гэтай ненармальнай разьвязцы спраў пасьля сусьветнай вайны.

Італьянскі міністр Грандзі ў Нямеччыне. Апошнімі днямі ў Бэрлін прыехаў з палітычнымі адведзінамі італьянскі міністар Грандзі. Міністар Грандзі ў Бэрліне сказаў праз радіо прамову, у якой выявіў нямецкаму народу сымпатыі ад імя Мусоліняга. У гутарках мін. Грандзі з нямецкімі міністрамі абгаварываліся справы палітычныя міжнароднага значэньня.

Водгукі заявы сэнатара Бората, прамовы Мусоліняга і адведзінаў Грандзіям Нямеччыны. „Kurjer Waršaŭski“ зьмяшчае алярмуючую тэлеграму з Парыжа, у якой цьвердзіць, што ад 1918 году міжнародная атмасфэра ніколі ня была для Польшчы такой небясьпечнай, як цяпер.

Заява сэнатара Бората ў Парыжы не зрабіла ніякага водгуку, а ў ангельскай прэсе спаткалася з прызнаньнем.

Адведзіны Грандзіяга і прамова Мусоліняга ідуць па лініі заявы Бората.

Гаспадарчая труднасьць СССР. Бальшавікі нямала маюць клопату з даўгамі, бо трэба выкупляць свае вэксалі ў Англіі (на 7 мільёнаў фунтаў штэрлінгаў) ў Амэрыцы, Нямеччыне, Польшчы і Швэцыі, разам на суму каля 3 з палавінай мільярдаў зл., а тут у нутры пачалі бунтавацца ды не даваць „кантрыбуцыі“ калгасы.

Бальшавіцкія газэты падаюць, што колектыўныя гаспадаркі спрацівіліся аддаваць вызначаную часьць уражаю гарадзкім камунам, пакуль не забясьпечаць прадуктамі сяброў калгасаў, ня створаць запасаў збожжа на пасеў і на пракармленьне жывога інвэнтара; і толькі тады, калі астанецца збожжа, дык лішак аддадуць у гарадзкія камуны. Але такая збажовая палітыка калгасаў пакідае горад і чыноўнікаў бяз хлеба, дык камуністычная ўлада пастанавіла забіраць дзяржаўную долю ўражаю ад калгасаў наўперад, пакідаючы сяброў калгасаў бяз хлеба і насеньня. Словам, хто мае большую сілу, той мае і хлеб.

З Вільні.

Акадэмія ў чэсьць Вітаўта Вялікага. Польскі Вітаўтаўскі Камітэт дня 27 г. м. наладзіў урачыстую акадэмію ў чэсьць Вітаўта з прычыны 501 гадаўшчыны яго сьмерці.

Вітаўт Вялікі гэта волат духовы нашага краю. Ідэя ягоная жыве і паглыбляецца. Вітаўт Вялікі гэта духовы павадыр Літвы і Беларусі. Дзеля гэтага ў мінулым годзе беларусы разам з літоўцамі належна сьяткавалі 500 угодкі сьмерці свайго духовага павадыра Вітаўта Вялікага. Але, як бачым, не забыліся аб ім і палякі.

Праект падвышкі падаткаў. Віленскі магістрат шукае спосабу, якбы падняць вышэй падатак.

Безработцьце. У Вільні разам з цэлым віленскім ваяводзтвам налічваецца 3965 асоб безработных.

Пратэставаныя вэксалі. У Вільні і ў ваўсім віленскім ваяводзтве ў м-цы верасьні с. г. запратэставана 13.308 штук вэксалёў на суму 2508 тыс. зл.

За месяц 136 ліцытацыяў. У Вільні за м-ц верасень с. г адбылося 136 ліцытацыяў маемасьці на суму 150 тысяч зл.

Большасьць гэнай зліцытаванай маемасьці належала да дробнага мяшчанства і інтэлігенцыі.

Чытайце і пашырайце „Беларускую Крыніцу!“

Да нас пішуць.

ЗАСЫПАЙМА ПРОПАСЬЦЬ РЭЛІГІЙНАГА ПАДЗЕЛУ.

Казлоўшчына, Пастаўскага пав. Каля нас беларусы падзелены рэлігійна на праваслаўных і каталікоў. Праваслаўныя называюць сваю веру „рускай,“ а каталікі сваю веру „польскай.“ Гэткае паняцьце аб веры падтрымліваюць сярод нашых людзей расейскія праваслаўныя сьвяшчэньнікі і польскія каталіцкія ксяндзы. З прычыны такога ненармальнага зьявішча сярод нашага народу і ахвотнага яго паглыбляньня чужым для беларусаў духавенствам — расейскім і польскім, бываюць і сумныя здарэньні.

У в. Асіна-Гарадок, недалёка ад нас ёсьць праваслаўная парафіяльная царква. У дзень сьвята Найсьвяцейшай Дзевы Марыі 2 ліпня (па старому стылю) адбываецца ў гэтай царкве вялікай урачыстасьці набажэнства. На гэты фэст зьяжджаецца многа праваслаўнага духавенства і многа выходзіцца народу і праваслаўных і каталікоў. Вось у часе працэсіі сёлетняга фэсту здарыўся прыкры выпадак, віноўнікам якога быў праяжджаючы польскі ксёндз. Але дзякуючы развазе нашых людзей інцыдэнт у самым пачатку быў зьліквідаваны.

Браты Беларусы — праваслаўныя і каталікі! Зразумейма, што няма вераў ані „рускай“' ані „польскай,“ а мы вызнаём адны веру праваслаўную, а другія каталіцкую. Зразумейма і тое, што над намі адзін Бог і мы, як адны так і другія, сьвяткуем культ Найсьвяцейшай Дзевы Марыі, а так-жа нам трэба ведаць і тое, што падзялілі нас на „рускіх“ і „польскіх“ духоўныя жандары.

Дык не паддаваймася гэтаму шкоднаму падзелу, шукайма згоды і любові і засыпайма пропасьць рэлігійнага між намі падзелу.

Стары Беларус.

БЕЛАРУСКАЕ ПРАДСТАЎЛЕНЬНЕ.

Вялікая Ліпа, Нясьвіскага пав. У нас ёсьць гурток Б. І. Г. і К. Моладзь зарганізаваная разам з старэйшымі на Пакровы зладзіла беларускае прадстаўленьне. Адыгралі сцэнічны твор „Суд над трохпалёўкай.“ Увесь даход ад прадстаўленьня аддаль на беларускую бібліатэку, якая абслужвае нашу ваколіцу кніжкамі В. Х.

У БЕДНЫХ ЗЬБІРАЮЦЬ ДЛЯ ГАЛОДНЫХ.

Баяры, Нясьвіскага пав. У нас пачалі зборку бульбы для безработных. Нашы людзі ніколі не працівяцца памагчы другім няшчасным, але на жаль, калі яны і самы бедныя, якім трэба на добры лад памагчы. Але што ты чалавеча зробіш з гэтай бядой. Адно толькі цешыць, што нашы сяляне трымаюцца пагаворкі „лепш даваць як прасіць“ і ніколі не адмаўляюць хоць скромнай падачкі просячым.

Баярац.

БЯДНОЦТВА ДУХОВАЕ І ПРАГАВІТАСЬЦЬ БАГАЦЬЦЯ.

Пастаўшчына, Бедныя каля нас людзі, цяжка ім жывецца; але духова яны бяднейшыя чымсьць матэр'яльна. На мой пагляд, каб наш народ быў багацейшы духова, дык гэтая матэр'яльнае бядноцтва ня было-б такім страшным, якім яно ёсьць цяпер. Дзіўна неяк, што нашы людзі аб бядноце матэр'яльнай заўсяды гавораць, бядуюць, наракаюць а аб беднасьці сваей духовай дык і ўспамінаць ня ўмеюць. Я таксама бедны чалавек, але не магу зразумець таго, як гэта можна папраўіць лёс матэр'яльнага быту ня маючы багацьця сілы духовай. А гэтае бядноцтва духовае ў нашым народзе куды горшае ад бядноцтва матэр'яльнага. І дзіўна, людзі нашы хочуць папраўіць свой лёс і ўзбагацець, каб хоць мець дастатак неабходны да жыцьця не стараючыся ўзбагачывацца ў сілу духа. Прыкладам, ня хочуць нашы людзі ані вучыцца ані маліцца. За адну няшчасную залатоўку дзяўчына йдзе ў двор у сьвята на Пакровы церабіць капусту. Моладзь замест, каб чытаць газэты або кніжкі „рэжа“ вячарамі ў будні, а сьвятам і цэлы дзень у карты. Царквы моладзь ужо проста стыдаецца.

На мой пагляд, тут многа вінавата духавенства. Але трэба ведаць, што мы беларусы ня маем свайго беларускага духавенства, яно ў нас чужое, дык і ня дбае пра наш народ.

Дарагая моладзь, даволі блудзіць у цемры, шукайма сьвятла і сьцежкі да лепшых дзён. Чытайма свае газэты і добрыя кніжкі а з туль даведаемся што трэба рабіць, каб перамагчы злыбяду.

Праваслаўны селянін.

З краю.

Пратэсты вэксалёў. Паводле афіцыяльнага падлічэньня статыстычнага бюра Прамыслова-Гандлёвай інстытуцыі ў Вільні, у верасьні сёл. году запратэставана вэксалёў:

У ваяводзтве Беластоцкім — 22218 на 3762 тыс. зл., у ваяводзтве Навагрудзкім — 8190 на 1536 тыс. зл., у ваяводзтве Палескім — 9551 на 1505 тыс. зл.

Абурэньне на сэквэстратара. У в. Хвецэвічах, Смаргонскай гм. здарыўся вось такі выпадак. Сэквэстратар Янчуковіч прыехаўшы ў вёску пачаў забіраць апошнія падушкі і быдла. Сяляне пачалі прасіць сэквэстратара, каб адлажыў сваё „урадаваньне“ і калі сэквэстратар не паслухаў, сяляне адабралі свае падушкі і быдла, а сэквэстратара прагналі з вёскі. Прыбыўшая на ўсьмірэньне паліцыя, арыштавала селяніна Качаноўскага.

Страшная сьмерць. Надовячы жыхара в. Сурмачэво, Браслаўскага пав. Я. Мілеўскага падчас раскопываньня гары каля тае ж вёскі засыпала зямля, забіваючы яго на сьмерць.

Усячына.

Сьмерць Эдісона. Дня 18 г. м. у Амэрыцы памёр ведамы вучоны і вынаходнік Т. А. Эдісон. Эдісон памёр маючы 84 гады.

Зьезд бязбожнікаў у Маскве. У Маскве пачаўся зьезд бязбожнікаў. На зьезд прыехалі дэлегаты з Нямеччыны, Аўстрыі, Францыі, Бэльгіі і Галяндыі. Дэлегатамі апякуецца бальшавіцкі Саюз Ваюючых Бязбожнікаў.

За 11 гадзін пабудаваў дом. Адзін амэрыканскі архітэкт выйграў заклад 10 тысяч даляраў. Заклад быў аб тое, што гэны архітэкт у працягу 11 гадзін пабудуе дом. І ён пабудаваў. А гадзіне сёмай раніцы плошча пад будынак была яшчэ зарошчы травой, а гадзіне 9 работнікі залажылі фундамант, а ў 12 гадзіне ў паўдні муры дому былі накрыты страхой. Калі бляхары крылі бляхай дом, у нутры закладалі інсталяцыі, падлогі, вокна і г. д. У канцы пачалі працу маляры і а 6 гадзіне папаўдні дом саўсім быў кончаны. У дом прывезьлі мэблі і а гадзіне 7 у вечары ў тым доме запрошаныя госьці заселі за стол запоўнены напіткамі і закускай.

Naša pošta.

I. Pupin. Karespandencyju atrymali, dziakujem skarystajem.

I. Saŭku. Hazetu budziem pasyłać ad 1 listapada.

Staromu Biełarusu. Hazeta naša letam wychodziła radziej 2 razy na miesiac. U wieraśni wyjšła 3 razy. Wam zaŭsiody pasyłajecca akuratna, jak našamu supracoŭniku, trebujcie na pošcie. Kab pryśpiašyć sudowuju sprawu napišycie prakuroru ŭ Lwoŭ, paklikajučysia na pawiedamleńnie Was prakuraturaj Wilenskaj. Za karaspaudencyju dziakujem, skarystajem.

Lešuku. Atrymali, dziakuiem, wykarystajem.

Siwickamu P. Hazetu pasyłać budziem ad 1 listapada.

Žaŭrydu. Adras źmianiajem.

Chudnickamu. Atrymali, dziakujem, wykarystajem.

Ułasiku. Inž. Klimowič ciapier u wojsku i prabudzie da kanca listapada. Piśmo daručym, jak wierniecca.

Sawickamu. Ab seminaryi ŭ Dubnie dawiedajeciesia u 33 numary „B. K.“ Nawuka ŭ seminaryi i ŭtrymańnie biespłatna.

Prakapowiču. Dziakujem, nadrukuiem.

Centr. Praŭlen. Biełaruskaj Dem. Partyi ŭ Łatwii. Hazetu našu Wam na wymienu „Dumki Biełarusa“ pasyłajem.

Wiarbickamu. Wam pasyłajecca hazeta akuratna, trebujcie na pošcie. Adnaho i taho samaha numaru administracyja naša nikoli nie pasyłała, a ŭ sprawie wydačy Wam trojčy adzin i toj samy numar, winawata pošta.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.